*С. А. Паўлава,*
*кандыдат філалагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ГУМАНІСТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

Светапогляднай асновай дзейнасці сучасных бібліятэк з'яўляецца гуманізм – сістэма каштоўнасцей і прынцыпаў, у цэнтры якой знаходзіцца чалавек як найвышэйшая каштоўнасць. Асэнсаванне місіі бібліятэкі ў постіндустрыяльнай прасторы знайшло ў працах расійскіх навукоўцаў С. А. Басава, А. В. Сакалова, І. І. Ціхаміравай і інш. Па меркаванні С. А. Басава, «… хочацца, каб інфармацыя, падобна цені ў вядомай казцы Я. Шварца, заўсёды ведала сваё месца ў бібліятэцы, заставалася інструментальным сродкам задавальнення сацыяльна-культурных патрэбнасцей чалавека і грамадства» [2, с. 14].

Грунтоўная і цікавая думка А. В. Сакалова, які называе бібліятэку гуманістычным сімвалам нацыі: «Без гэтага сімвала нацыя страчвае ідэнтыфікацыю, як чалавек, страціўшы памяць і які забыў родную мову» [6, с. 30].

Гуманістычны шлях уваходжання бібліятэк у інфармацыйную прастору заключаецца ў пераўтварэнні бібліятэк у цэнтры бібліятэчнага гуманізму, якія выконваюць адукацыйныя, каштоўнасна-арыентацыйныя, маральна-этычныя, мемарыяльныя, культурна-экалагічныя функцыі гуманістычнай накіраванасці. Гэты шлях складаны: у айчынным бібліятэказнаўстве адсутнічаюць работы па тэарэтычным і навукова-метадычным асэнсаванні бібліятэчнага гуманізму, таму бібліятэчныя практыкі асэнсоўваюць яго на інтуітыўна-эмпірычным узроўні.

З пазіцыі эталоннага гуманізму, які прадстаўлены пяццю культурнымі ўніверсаліямі, бібліятэчны гуманізм уяўляе сабой інтэрпрэтацыю гэтых універсалій. Атрымліваецца наступная формула:

– рацыяналістычную ўніверсалію ў бібліятэцы прадстаўляюць фонды і бібліятэчныя супрацоўнікі, якія ствараюць гуманістычныя рэсурсы бібліятэчнага інстытута;

– свабода самарэалізацыі ўвасабляецца ў вольным доступе чытачоў да бібліятэчных фондаў;

– эстэтычную ўніверсалію прадстаўляе бібліятэчная прастора, якая ўключае архітэктурна-планіровачнае рашэнне будынка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі, дызайн, інтэр’еры, а таксама творы пісьменнасці і друку як прадметы мастацтва кнігі;

– аксіялагічная ўніверсалія зводзіцца да культурацэнтрызму, адпаведна якому бібліятэка служыць для чытачоў цэнтрам кніжнасці, інфармацыйнай культуры і непасрэдных стасункаў.

Па меркаванні А. В. Сакалова, «бібліятэчны гуманізм – такая сістэма прафесійнай бібліятэчнай дзейнасці, калі бібліятэка ўяўляе сабой рацыянальна і эстэтычна абгрунтаваны сацыяльна-культурны цэнтр гуманістычнай кніжнасці з вольным доступам да яго дакументных фондаў лакальных і аддаленых карыстальнікаў і дыялогавымі суб’ект-суб’ектнымі стасункамі чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэкі» [7].

Формула бібліятэчнага гуманізму характарызуе гуманістычную місію, якая рэалізуецца праз сістэму бібліятэчнага абслугоўвання. Галоўным рэсурсам гуманізацыі ў бібліятэчным абслугоўванні з’яўляецца багацце мастацкай літаратуры. Яна займае асноўнае месца ў змесце сістэмы гуманізацыі карыстальнікаў, таму што герой кожнага мастацкага твора – чалавек. Беларуская мастацкая літаратура як частка нацыянальнай культуры мае ў сваім арсенале вялікі патэнцыял духоўных каштоўнасцей, яе класічныя, узорныя творы развіваюць у чытачоў маральна-пачуццёвую сферу, творчае мысленне, вучаць бачыць свет ва ўсёй яго разнастайнасці. Чытанне як від камунікатыўнай дзейнасці ўплывае на фарміраванне светапогляду
і рост агульнаадукацыйнага ўзроўню. Менавіта праз беларускую літаратуру як праз сродак духоўнага асэнсавання чытачамі быцця нацыі засвойваюцца народныя звычаі, традыцыі. Глыбінныя нацыянальныя карані культуры, багатае гераічнае і трагічнае мінулае беларускага народа, праблемы і радасці сённяшняга жыцця, увасобленыя ў вобразах і лёсах літаратурных герояў, – усё гэта можна данесці да чытачоў праз творы беларускай мастацкай літаратуры, ствараючы ў бібліятэцы асаблівую духоўную прастору, якая выклікае жаданне чытаць і выказваць свае думкі аб прачытаным, аб сваіх праблемах і турботах, весці дыялог і ўдумліва ўспрымаць меркаванні іншых.

Для таго, каб спрацоўваў гуманістычны патэнцыял літаратуры, неабходна выкарыстоўваць другі рэсурс бібліятэчнага абслугоўвання – арсенал распрацаваных форм і метадаў. Па меры развіцця ў абслугоўванні склалася свая тэрмінасістэма, але, як вядома, тэрмінасістэмы гістарычныя, гэта значыць, што яны спецыфічныя для кожнага часу. Сучасная сістэма бібліятэчнага абслугоўвання складаецца з трох узаемазвязаных элементаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індывідуальная, групавая і франтальная масавая работа. Тэрміны бібліятэчнае «індывідуальнае», «масавае абслугоўванне» замацаваны ў тэрміналагічным слоўніку 1997 г. [3, с. 65]. У іх азначэнні асноўны акцэнт зроблены на задавальненні патрэбнасцей карыстальнікаў і насельніцтва як вынік дзейнасці і не пазначаны асаблівасці іх вывучэння. На наш погляд, трэба звярнуць увагу на тое, што ў сістэме бібліятэчнага абслугоўвання вылучаюцца і дзейнічаюць два суб’екты: з аднаго боку, бібліятэкар, які выконвае сваю прафесійную работу, з другога – чытач, які задавальняе свае патрэбнасці і разам з тым уплывае на працэс абслугоўвання. Калі пры індывідуальным абслугоўванні галоўным (але не адзіным) з’яўляецца ўлік адзінкавага – індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей кожнага з карыстальнікаў, то пры масавым абслугоўванні на першы план вылучаецца агульнае і асаблівае – наяўнасць агульных і асобасных рысаў у карыстальнікаў будзе асновай для вылучэння чытацкай групы і чытацкай аўдыторыі. Адносна ўсёй сістэмы абслугоўвання групавую работу можна ахарактарызаваць як катэгорыю «асаблівае», і яна выступае падсістэмай другога ўзроўню. Як самастойная сістэма групавая работа ў змястоўным плане стала самастойным відам стасункаў з чытачамі. Тэрмін «групавая работа» не атрымаў дакладнага адназначнага тлумачэння сярод спецыялістаў. Можна вылучыць тры падыходы да вызначэння дадзенага тэрміна, адпаведна якім і падаваўся змест групавой работы.

Адны лічылі групавую работу складнікам масавай [4]. Другія адносілі групавую работу да разнавіднасці індывідуальнай на той падставе, што ў першай здзяйсняецца індывідуалізацыя падыходу да асобы чытача. Ёсць нават меркаванне называць такую работу індывідуальна-групавой. Некаторыя даследчыкі вызначалі групавую работу на стыку індывідуальнай і масавай. Амаль усе аўтары падкрэслівалі эфектыўнасць групавой работы з чытачамі. Аднак не прапанавалі ні азначэння паняцця, ні змястоўных аспектаў групавой работы, ні абгрунтавання яе месца ў шэрагу кірункаў стасункаў бібліятэк з карыстальнікамі.

Групавая работа ў бібліятэказнаўстве не разглядалася з пункту гледжання сістэмнага падыходу, які дазваляе абгрунтаваць яе месца сярод іншых відаў бібліятэчнага абслугоўвання. Групавая работа дае магчымасць чытачам найбольш паспяхова рэалізаваць патрэбнасці ў зносінах з тымі, чые маральныя ўстаноўкі і этычныя погляды з’яўляюцца падобнымі.

Тэарэтыкі і практыкі адзначаюць вялікае значэнне высвятлення ўплыву міжгрупавых працэсаў, што становіцца актуальнай задачай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сёння. Менавіта групы найбольш моцна ўплываюць на рашэнні шматлікіх праблем асобы. Асаблівае месца займаюць кантактныя групы. У такіх групах рэалізуецца дэфіцыт нефармальных міжасобасных стасункаў, актывізуецца ўключанасць у творчую дзейнасць, у больш прадуктыўную сувязь з бібліятэкарам.

На групавых мерапрыемствах ёсць магчымасць не проста абмеркаваць праблемы, але і адчуць адзінства і эмацыянальную падтрымку. Актывізацыя міжасобасных стасункаў і цеснага эмацыянальнага кантакту знаходзіць больш поўнае ўвасабленне ў групавой рабоце. Бібліятэкар таксама ўключаецца ў рэферэнтнае кола чытацкіх стасункаў і можа заняць дамінуючае становішча.

На наш погляд, групавая работа з чытачамі ў публічных бібліятэках уяўляе сабой узаемазвязаную, узаемаўплывовую дзейнасць бібліятэкара і чытача. Гэта дзейнасць праяўляецца ў рэальна існуючых групах і ўплывае як на працэсы, якія адбываюцца ў іх, так і на фарміраванне новых груп. Змест педагагічнага працэсу ў бібліятэках цесна звязаны са структурай чытацкіх груп, дынамікай іх развіцця. Гэты працэс уключае два віды дзейнасці: дзейнасць чытацкіх груп і дзейнасць бібліятэкара. Асновай, на якой базіруецца гэты працэс, выступаюць інтарэсы і патрэбнасці чытачоў, стасункі і магчымасць задавальнення з боку бібліятэкі.

Актуальны на сучасным этапе гуманістычны падыход да асобы дазваляе больш глыбока ацэньваць праблемы групавой работы публічных бібліятэк. Каштоўнасць і ўнікальнасць індывідуальнага вопыту, які з'яўляецца асновай гэтага падыходу, даюць арыенціры ўдасканалення чытацкай дзейнасці асобы ва ўмовах псіхалагічнага дыскамфорту як на сацыяльным узроўні, так і на асобасным. Самарэгуляцыя чытацкай дзейнасці асобы дазваляе прагназаваць чытацкае развіццё. Абагульненне даных індывідуальных чытацкіх вопытаў дае магчымасць распрацоўваць мадэлі чытання для розных чытацкіх груп і з улікам гэтага праводзіць групавыя мерапрыемствы.

Невялікая колькасць ахопу на групавых мерапрыемствах і задавальненне патрэбнасці ў стасунках і ўзаемаўзбагачэнні – адметная рыса групавой работы. Ва ўмовах дэфіцыту непрагматычных адносін перад бібліятэкарамі адкрываюцца шырокія магчымасці развіваць культуру, садзейнічаць набыццю ведаў, арыентаваць на падтрымку агульначалавечых каштоўнасцей, дапамагаць здабыванню культурнай ідэнтычнасці, задавальняць патрэбнасці людзей у зносінах, адпачынку, творчасці, з чаго і складаецца сутнасць гуманістычнай накіраванасці бібліятэчнага абслугоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Антипина, Г. С.* Теоретико-методологические проблемы исследования малых социальных групп / Г. С. Антипина. – Л. : ЛГУ, 1982. – 110 с.

2. *Басов, С. А.* О королях и капусте / С. А. Басов // Библиотечное дело. – 2011. – № 7. – 14 с.

3. *Библиотечное* дело : терминолог. слов. / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – 168 с.

4. *Дворкина, М. Я.* Изучение идеологической эффективности массовой (групповой) пропаганды в ЦБС / М. Я. Дворкина, Ю. П. Маркова // Централизация библиотечного дела : итоги и перспективы : межвуз. сб. науч. тр. – М. : МГИК, 1982. – С. 59–69.

5. *Соколов, А. В.* Гуманистическая миссия библиотек в цифровую эпоху / А. В. Соколов. – URL : www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea 2012/disk/129.pdf.

6. *Соколов, А. В.* Гуманистический символ нации / А. В. Соколов // Библиотечное дело. – 2011. – № 7. – С. 30.

7. *Соколов, А. В.* Миссия и мутации библиотек. Раздумья интеллигента-книжника / А. В. Соколов // Библиотечное дело. – 2009. – № 14 (104). – С. 2–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ